Абітурыент-2019

ПРАВА НА АДНУ ПАМЫЛКУ

Як спрацавала новая сістэма падліку балаў на ЦТ

Сёлета для абітурыентаў дзейнічае новая сістэма падліку балаў на ЦТ. Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК лічыць, што такая методыка дазваляе лепш ацаніць рэальныя веды хлопцаў і дзяўчат, чым папярэдняя.

Ён адзначае, што сёлета працэнт абітурыентаў, якія набралі 70—75 балаў, такі ж, як і летась, таму і канкурэнцыя паміж імі будзе трымацца на аднолькавым узроўні. Мінімальныя прахадныя балы не вельмі адрозніваюцца ад паказчыкаў папярэдняга года, аднак у далейшым чакаецца іх павышэнне.

— Ёсць меркаванне, што новая методыка недаацэньвае добра падрыхтаваных абітурыентаў. Лічу, што такое меркаванне некарэктнае. Методыка не адбірае балы, яна іх налічвае. Той, хто атрымлівае больш першасных балаў, мае і больш тэставых. Трэба адзначыць, што шкала падліку балаў не з'яўляецца лінейнай. Можна трактаваць гэта з пункту гледжання спорту: апошнія метры перад фінішам самыя каштоўныя. Сёлета мы не ацэньваем кожнае заданне паасобку, бо гэта суб'ектыўна: хтосьці лічыць пэўнае заданне лёгкім, а некаму яно здаецца цяжкім. Таму новая методыка падліку балаў — гэта інструмент адлюстравання паўнаты ведаў, а не пэўных выкананых задач. І сумненні ў яе эфектыўнасці, аб'ектыўнасці не павінна быць ні ў абітурыентаў, ні ў іх бацькоў, настаўнікаў або рэпетытараў.

Юрый Міксюк не адмаўляе, што магчымасць «угадаць» правільныя адказы існуе, аднак яна зводзіцца да мінімуму. Таксама абітурыенты павінны ведаць, што часткова правільны адказ — гэта не палова рашэння. Ён дапускае толькі адну памылку.

— Напрыклад, у пэўным заданні часткі «А» павінна быць тры правільныя варыянты адказу. Калі хлопец або дзяўчына адзначае да гэтых трох чацвёрты або дае два правільныя пункты з трох — адказ часткова правільны. Калі ж вызначаецца лішні варыянт, а другі не дапісваецца, заданне не залічваецца.

Юрый Міксюк дадае, што сёлета па матэматыцы толькі 50 працэнтаў абітурыентаў змаглі рашыць больш за дзесяць заданняў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Сістэмы відэаназірання і Wi-Fi

цяпер ёсць на адноўленай аўтастанцыі ў Петрыкаве

Райцэнтр рыхтуецца да правядзення абласных Дажынак-2019. І цалкам рэканструяваная аўтастанцыя — першы падарунак гораду ў глыбінцы Палесся.

Рэканструкцыю за ўласныя грошы выканаў яе ўласнік — адкрытае акцыянернае таварыства «Гомельаблаўтатранс». Агульная сума ўкладзеных прадпрыемствам сродкаў складае 390 тысяч рублёў. Справіліся за чатыры месяцы.

Першая ў гісторыі Петрыкава аўтастанцыя знаходзілася ў цэнтры горада. За 45 гадоў значна павялічылася колькасць пасажыраў. Узраслі і іх патрабаванні да камфорту. Пасля рэканструкцыі будынак набыў новае аблічча. Цяпер тут абсталявана сучасная зала чакання з мультымедыйным экранам і Wi-Fi, сістэмай гучнай сувязі, магчымасцю зарадкі мабільных тэлефонаў і ноўтбукаў, сістэмай відэаназірання і ахоўна-пажарнай сігналізацыяй. Падсілкавацца перад дальняй дарогай пасажыры могуць у кавярні, аформленай з беларускім каларытам.

Цалкам абноўлены перон і тэрыторыя навокал. Будынак упрыгожаны керамагранітам, устаноўлены дэкаратыўная агароджа і новы навес на пероне. Як паведаміў **намеснік дырэктара ААТ «Гомельаблаўтатранс» Алег ЦЫЛЬКО,** падчас рэканструкцыі стварылі безбар'ернае асяроддзе для пасажыраў з абмежаванымі магчымасцямі.

Аўтастанцыя ў Петрыкаве сёння прапануе ўвесь спектр запатрабаваных паслуг: ад продажу квіткоў анлайн да афармлення праезду па маршрутах фармату «цягнік+аўтобус». Цяпер аўтастанцыя абслугоўвае 24 прыгарадныя і чатыры міжгародныя маршруты, а штодзённы пасажыраабарот складае 250 чалавек.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Надвор'е

Вецер ірве правады

А яшчэ нас чакаюць ападкі і тэмпературны фон, на 3—5 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму

Няўстойлівае, халаднаватае і ветранае надвор'е з кароткачасовымі дажджамі і навальніцамі чакаецца ў нашай краіне ў выхадныя, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. А ў найбліжэйшыя дні ў Беларусі ўмовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты і халодныя паветраныя масы.

Сёння ўдзень атмасферны фронт абумовіць на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы. У некаторых раёнах прагрымяць навальніцы. Раніцай і **ўдзень у многіх раёнах краіны чакаецца моцны парывісты вецер, у сувязі з чым аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі.** Максімальная тэмпература паветра складзе ў асноўным 13—19 цяпла, толькі па поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 23 градусаў. Надвор'е ў суботу будзе вызначаць прахалодная няўстойлівая паветраная маса балтыйскага паходжання. Месцамі, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень у некаторых раёнах магчымы навальніцы. Захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ў асноўным ад плюс 17 да плюс 23 градусаў, у паўночна-ўсходніх раёнах краіны — не вышэй за 14—16 цяпла. У нядзелю атмасферны фронт абумовіць на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы, у некаторых раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 цяпла, днём будзе ад плюс 14 градусаў па поўначы да 25 градусаў па поўдні краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца няўстойлівае халаднаватае надвор'е. Уначы месцамі, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У некаторых раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 цяпла, удзень — ад плюс 16 да плюс 23 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Па папараць-кветку — у Александрыю

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета ўдзел у фестывалі бяруць больш за дзве тысячы прафесійных і самадзейных артыстаў, майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Польшчы.

Свята ў Александрыі славіцца сваімі хлебасольнымі традыцыямі, на ім можна смачна паесці і нешта прыхапіць з сабой. Прысмакамі на любы густ парадуюць прадстаўнікі спажыўкааперацыі, якія яшчэ за шмат дзён да пачатку зманціравалі на купальскай пляцоўцы свае кавярні пад адкрытым небам.

«Купалле» ў Александрыі — знакавае культурна-асветніцкае мерапрыемства. Аматараў літаратуры сюды вабіць вялікі кніжны кірмаш, які дае магчымасць азнаёміцца з найлепшымі творамі выдавецкай дзейнасці, прасачыць гісторыю стварэння кнігі і папоўніць дамашнюю бібліятэку. На «кніжнай» пляцоўцы будзе працаваць «Друкарскі двор», дзе кожны ахвотны зможа на адноўленым па старых гравюрах друкарскім станку XVI стагоддзя надрукаваць старонку з Бібліі Францыска Скарыны. Тут жа адбудуцца прэзентацыі новых кніг і часопісаў, у тым ліку літаратурных навінак выдавецкага дома «Звязда», пройдуць творчыя сустрэчы з аўтарамі, шмат цікавых конкурсаў і віктарын.

Фота БелТА.

Маладых і крэатыўных запросіць пляцоўка «Творчасць маладых», дзе юнакі і дзяўчаты прадэманструюць свае навукова-тэхнічныя праграмы, а таксама спартыўныя і творчыя перамогі. Распрацоўкі айчыннага аўтапраму для сельскай гаспадаркі і не толькі пакажа Мінскі трактарны завод. А самым вясёлым для дзяцей і дарослых стане першае «Свята цырка ў Александрыі» цырка-шапіто SIRIUS. Як нагадаў **дырэктар Магілёўскай абласной філармоніі Дзяніс ШАБЛІНСКІ,** падчас фестывалю па традыцыі працуюць дзве дадатковыя пляцоўкі: малая сцэна для рэгіянальных калектываў і сцэна народнай творчасці, дзе прадстаўлена аўтэнтычная беларуская культура — спевы, музыка і танцы; дзейнічаюць атракцыёны і маляўнічыя фотапляцоўкі, праходзяць шматлікія гульні, майстар-класы, спартыўныя і творчыя спаборніцтвы, тэматычныя квэсты і г. д.

Кульмінацыяй свята стане гала-канцэрт «Зроблена ў Беларусі» — шоу высокатэхналагічнае, выкананае па лепшых сусветных лякалах і разам з тым нацыянальнае, зробленае ўласнымі творчымі сіламі, заснаванае на нашай культурнай спадчыне і традыцыях. Аснову канцэрта складзе музычны альбом «Куточак Беларусі», за які паэтка і спявачка Юлія Быкава і прадзюсар, кампазітар Яўген Алейнік былі адзначаны высокай прэміяй Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне».

Галоўны рэжысёр гала-канцэрта, выкладчык кафедры рэжысуры БДУКМ Агата МАЦКО крышачку прыадкрыла для нас галоўную інтрыгу гэтай падзеі:

— У двухгадзіннай пастаноўцы ўдзельнічаюць усе самыя лепшыя і вядомыя артысты Беларусі, а таксама выканаўцы з Расіі і Украіны. Толькі на сцэне будзе задзейнічана каля 300 чалавек. Пры пастаноўцы выкарыстаныя некаторыя тэхнічна складаныя прыёмы: напрыклад, сцэна будзе... проста ў сцэне. Але тут без падрабязнасцяў, павінна ж быць нейкая загадка.

Як расказала «Звяздзе» аўтар ідэі праекта, **спявачка Юлія БЫКАВА,** у канцэрце прагучыць сама меней 18 песень: «Хацелася, канешне, уключыць у храна-метраж як мага больш, аднак мы любім і шануем сваю публіку, таму выбралі толькі самае-самае, хіты, якія карыстаюцца найбольшай папулярнасцю ў слухачоў». Усе кампазіцыі прагучаць ужывую, у суправаджэнні прыкладна 35 музыкантаў — і ў гэтым галоўная адметнасць і прадмет гонару пастаноўшчыкаў, бо душэўная, шчырая атмасфера жывога канцэрта пад адкрытым небам сапраўды непараўнальная ні з якімі, нават самымі вялікімі, закрытымі заламі... Як любяць і шануюць родныя мясціны ў Беларусі, разам з гуртом «Аўра» праспяваюць папулярныя артысты розных пакаленняў: Анатоль Ярмоленка, Іна Афанасьева, Аляксандр Саладуха, Алена Ланская, Іскуі Абалян, Вікторыя Алешка, Руслан Асланаў, Вольга Сацюк, гурт «Дразды». Плануецца і некалькі дуэтаў: адзін з іх, перапляценне беларускай і ўкраінскай народных песень, рыхтуюць Юлія Быкава і Ціна Караль, другі выканаюць два народныя артысты брацкіх краін — Анатоль Ярмоленка і Леў Лешчанка. Дадаткова шоу ўпрыгожаць харэаграфічныя пастаноўкі — і традыцыйныя купальскія карагоды, і сучасныя пластычныя замалёўкі, а эфектную кропку дапаможа паставіць Дзяржаўны ансамбль танцу Беларусі.

Зрэшты, пасля канцэрта, піратэхнічнага шоу і маладзёжнай дыскатэкі да трох гадзін раніцы рэспубліканскае свята «Купалле» не завершыцца. На другі дзень купальскія пляцоўкі працягнуць работу. Адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўшанавання перадавікоў аграпрамысловага комплексу вобласці і канцэрт у гонар працаўнікоў сяла народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі і ансамбля «Сябры».

Цяпер крыху пра тэхнічныя моманты. Майце на ўвазе, што не заблукаць сярод шматлікіх пляцовак купальскага гарадка дапамогуць устаноўленыя тут інфармацыйныя паказальнікі. Для зручнасці гасцей будуць працаваць камеры захоўвання і пункт абмену валют. А на тэрыторыі Александрыі будзе абсталяваны імправізаваны палатачны лагер. Прадугледжаны дадатковыя рэйсы цягнікоў і аўтобусаў, увязаныя з пачаткам і заканчэннем мерапрыемстваў. Для гасцей, якія прыбылі на асабістым транспарце па аўтадарозе Орша—Шклоў—Магілёў (Р-76), у вёсцы Межнік і гарадскім пасёлку Копысь падрыхтаваны паркоўкі. Для перавозкі гасцей свята ад парковачных месцаў і да Александрыі пастаянна будуць курсіраваць аўтобусы. Паркоўка для інвалідаў знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад тэрыторыі купальскага свята — каля крамы.

Уваход на фестываль, дарэчы, вольны, платныя толькі квіткі на канцэрт «Сяброў» і гала-канцэрт «Зроблена ў Беларусі». І ведаеце што? Білетаў засталіся лічаныя адзінкі!

Нэлі ЗІГУЛЯ, Вікторыя ЦЕЛЯШУК.